View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by BSU Digital Library



лей связаны имена всех Верховных Главнокомандующих — великого князя Николая Николаевича Романова, императора Николая II, генералов М.В. Алексеева, А.А. Брусилова, Л.Г. Корнилова, Н.Н. Духонина. В Беларуси принимались судьбоносные решения, влиявшие на ход войны не только на восточном фронте, но и во всей Европе.

**Библиографический список**

1. Военное министерство // Военная энциклопедия: в 6 т. / под ред. В.Ф. Новицкого [и др.]. — СПб.: Т-во И.Д. Сытина, 1911—1915. — Т. 6. — С. 489.
2. Военно-окружные управления // Свод военных постановлений 1869 года. — 2-е изд. — СПб., 1893. — Кн. 2. — С. 197.
3. Залесский, К.А. Первая мировая война: энцикл.: в 2 ч. / К.А. Залесский. — М.: ФИВ, 2014. — Ч. 2: Русская действующая армия. — С. 638.
4. Двинский военный округ // Центральный государственный военно-исторический архив СССР: путеводитель: в 3 ч. / ред. В.Н. Автократов [и др.]. — М., 1979. — Ч. 1. — С. 133.
5. Минский военный округ // Центральный государственный военно-исторический архив СССР: путеводитель: в 3 ч. / ред. В.Н. Автократов [и др.]. — М., 1979. — Ч. 1. — С. 145.

**Мазец Валянцін Генрыхавіч**
*Інстытут гісторыі НАН Беларусі (Мінск, Беларусь)*

# ПРАБЛЕМА ДЗЯРЖАЎНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАГА ВЫЗНАЧЭННЯ БЕЛАРУСІ Ў 1915—1917 гг.

Працэс фарміравання дзяржавы нязменна суправаджаецца дзяржаўна-тэрытарыяльным вызначэннем. Беларускія этнічныя землі, знаходзячыся ў складзе Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай, Смаленскай і Чарнігаўскай губерняў Расійскай імперыі, не складалі асобнай тэрытарыяльнай адзінкі [3, с. 149—150]. Расійскія ўлады не разглядалі беларусаў у якасці асобнага этнаса, здольнага ствараць самастойную дзяржаву [3, с. 179]. Акрамя таго, Расійская імперыя да пачатку Першай сусветнай вайны была дастаткова моцнай, каб стрымліваць цэнтрабежныя сілы, якія маглі б выклікаць яе распад.

Сітуацыя істотна змянілася ў сувязі з разгортваннем Першай сусветнай вайны. У выніку наступлення германскіх войск у кастрычніку 1915 г. расійска-германскі фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск — Па-

ставы — Смаргонь — Баранавічы — Пінск. У зоне германскай акупацыі апынулася амаль уся тэрыторыя Віленскай і Гродзенскай губерні і частка Мінскай плошчаю 50 тыс. $км^2$, што складала прыкладна 25 % сучаснай тэрыторыі Беларусі [6, с. 154].

У ходзе вайны ролю аднаго з важнейшых геапалітычных чыннікаў у працэсе вырашэння дзяржаўна-тэрытарыяльнага пытання на карысць тых або іншых народаў стала выконваць Германія. Менавіта ад таго, якія народы на часова занятай германскімі войскамі тэрыторыі атрымаюць ад акупацыйных уладаў падтрымку, у многім залежала, як паспяхова будзе разгортвацца працэс іх дзяржаўнага будаўніцтва. Але пры гэтым нельга забываць, што, па-першае, «германскія ўлады напачатку слаба арыентаваліся ў нацыянальным становішчы ў акупіраваных раёнах Расійскай імперыі» [3, с. 305], па-другое, для Германіі гэтае пытанне, нягледзечы на абвешчаныя дэкларацыі аб падтрымцы паняволеных Расіяй народаў, не з'яўлялася прыярытэтным [9, с. 113]. Яе ваенна-стратэгічныя мэты ў дачыненні да далейшага лёсу гэтых народаў і іх тэрыторыі насілі захопніцкі характар. Так, у пратаколе нарады германскага канцлера Т. фон Бэтмана-Гольвега, якая адбылася 23 красавіка 1917 г., адзначалася: «...На поўдні Вярхоўнае кіраўніцтва задаволіцца тым, што будзе мяжа па лініі Беласток — Нёман на поўдзень ад Ліды. Белавежская пушча павінна быць набыта як дзяржаўная маёмасць» [10, с. 719]. Відавочна, што астатнія беларускія этнічныя землі, якія знаходзіліся на ўсход ад адзначанай на нарадзе мяжы, у сферу стратэгічных інтарэсаў Германіі не ўваходзілі і таму германскі ўрад ўстрымліваўся ад канчатковага вызначэння лёсу гэтых земляў [9, с. 114].

Разам з тым вайна прывяла да аслаблення патэнцыяльных магчымасцяў прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху ў справе вырашэння дзяржаўна-тэрытарыяльнага пытання. У зоне германскай акупацыі па прычыне вузкай сацыяльнай базы, неабходнай дзеля рэалізацыі этнанацыянальнай мадэлі дзяржаўнасці, беларускія палітычныя дзеячы, аб'яднаныя вакол Беларускага Народнага Камітэта, да сярэдзіны 1917 г. прытрымліваліся краёвай ідэі [3, с. 305—306] і схіляліся да адраджэння дзяржаўнасці ў форме ВКЛ, аб'яднаўшы беларускія і літоўскія землі [2, с. 453—454]. Немагчымасць рэалізацыі гэтай ідэі стала канчаткова відавочнай пасля таго, як ад імя Савета літоўскага народа быў выдадзены «Мемарандум аб аднаўленні незалежнай Літвы», у якім дэкларававаўся намер уключыць у склад ствараемай Літоўскай дзяржавы Віленскую, Гродзенскую і Навагрудскі павет Мінскай губерні [12, с. 49]. Дадзеныя абставіны абумовілі змену

падыходаў прадстаўнікоў беларускіх арганізацый да вырашэння дзяржаўна-тэрытарыяльнага пытання. У чэрвені 1917 г. была заснавана Сувязь Незалежнасці і Непадзельнасці Беларусі на чале з В. Ластоўскім. На сходзе членаў гэтай арганізацыі 2 чэрвеня 1917 г. была прынятая рэзалюцыя, у якой акрэслівалася галоўная яе мэта: «Каб часова і выпадкова раздзеленая ваенным фронтам на дзве палавіны Беларусь была злучана ў адзін суцэльны і Незалежны арганізм», а «ўнезалежненьне нацыянальна-тэрытарыяльнай Беларусі было пастаноўлена міжнародным кангрэсам» [5, с. 16—17].

Да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. на неакупаванай германскімі войскамі тэрыторыі дзейнасць беларускіх арганізацый, якія ставілі б перад сабой палітычныя мэты, была немагчымая. Пасля звяржэння самадзяржаўя на абшарах былой імперыі выразна намецілася тэндэнцыя да «стварэння шэрага кампактных, параўнальна аднародных паводле этнічнага складу насельніцтва нацыянальных дзяржаў» [8, с. 6]. На з’ездзе беларускіх арганізацый і партый у сакавіку 1917 г. сакратар этнаграфічнай камісіі М.Кахановіч прапанаваў лічыць этнаграфічнымі межамі Беларусі тэрыторыі, на якіх кампактна пражываюць і маюць перавагу беларусы, а менавіта губерні Віленскую, Віцебскую, Гродзенскую, Магілёўскую, Мінскую і часткова — Смаленскую і Чарнігаўскую [12, с. 58]. Пры гэтым пытанне пра стварэнне незалежнай беларускай нацыянальнай дзяржавы не разглядалася. У прынятай на з’ездзе рэзалюцыі дэлегаты выказаліся «за аўтаномнае адбудаванне Беларусі ў граніцах Расіі», а таксама за «зварот забранай (акупаванай германскімі войскамі. — *В.М.*) часткі этнаграфічнай Беларусі, і далучэнне яе, аб’яднанай з рэштай Беларусі, да Расейскай Федэратыўнай Рэспублікі» [11, с. 89—90]. Адначасова з беларусамі, у сакавіку 1917 г., свае прэтэнзіі на Чарнігаўскую губерню заявіла Украінская Цэнтральная рада, на Віленскую губерню — Літоўскі нацыянальны савет у Петраградзе, а на Рэжыцкі, Люцынскі і Дзвінскі паветы Віцебскай губерні — Паўднёва-Відземскі земскі з’езд у Вальмары, які выказаўся за стварэнне аўтаномнай адміністрацыйнай адзінкі «Латвія» [8, с. 8].

Для паспяховага вырашэння дзяржаўна-тэрытарыяльнага пытання неабходнай перадумовай з’яўляецца наяўнасць уласных збройных сіл, здольных абараніць межы сваёй дзяржавы. У 1917 г. выразна выявілася, «што беларускія нацыянальныя дамаганні толькі тады будуць споўненыя, калі кожнае з іх будзе падпірацца не старанна матываванымі дэкларацыямі, а моцнай нацыянальна-беларускай сілай, найлепш жа — сілай аружнай» [7, с. 38]. Яшчэ ў сакавіку 1917 г. прадстаўнікі беларускіх арганізацый і партый выказаліся за стварэнне нацыянальнага войска. Але дазволу на

арганізацыю беларускага войска ўрад А. Керанскага не даваў [4, арк. 138]. Тым не менш працэс арганіцыйнага афармлення беларускага нацыянальнага руху ў войску адбываўся. 5—6 жніўня 1917 г. на з'ездзе беларускіх арганізацый быў прыняты «Статут Беларускіх Нацыянальных Культурна-Прасветных Гурткоў у Войску», у якім адзначалася, што «кожны беларускі гурток... павінен весьці шырокую агітацыю... за аўтаномію Беларусі і стаяць супраць усякіх цэнтралістычных кірункаў» [11, с. 93].

Паколькі вялікая колькасць мабілізаваных беларусаў знаходзіліся паза межамі Беларусі, то на працягу лістапада — снежня 1917 г. былі скліканыя беларускія з'езды армій Паўночнага, Румынскага і Паўднёва-Заходняга франтоў, дэлегаты якіх уздымалі дзяржаўна-тэрытарыяльнае пытанне [7, с. 40]. У рэзалюцыі з'езда воінаў-беларусаў Паўночнага фронту быў выказаны пратэст супраць намераў Германіі перадаць занятыя германскімі войскамі беларускія этнічныя тэрыторыі ў склад Літоўскай дзяржавы, а таксама адзначана безгрунтоўнасць прэтэнзій Польшчы на паветы Гродзенскай губерніі і латышоў на Люцынскі, Рэжыцкі і Дзвінскі паветы Віцебскай губерніі [12, с. 66].

Маючы ў сваім распараджэнні пэўную сілу (агульная колькасць членаў розных беларускіх грамадска-палітычных аб'яднанняў, якія мелі прадстаўніцтва ў Цэнтральнай радзе беларускіх арганізацый, складала ў кастрычніку 1917 г. больш за 27 тыс. чалавек [9, с.133]), Вялікая Беларуская Рада разам з ЦБВР у канцы кастрычніка 1917 г. «рыхтаваліся дзеля прыняцця ўсёй улады на абшарах этнаграфічнай Беларусі» [1, с. 6].

У кастрычніку 1917 г. да ўлады ў Петраградзе прыйшлі бальшавікі. Абвешчаны імі ў апублікаванай 2 лістапада 1917 г. «Дэкларацыі правоў народаў Расіі» лозунг права народаў на вольнае самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў даваў тэарэтычную магчымасць для вырашэння праблемы дзяржаўнага-тэрытарыяльнага ўладкавання Беларусі. І беларусы не прамінулі выкарыстаць такую магчымасць. Так, у сумеснай грамаце ВБР і ЦБВР «Да ўсяго Народа Беларускага» у агульных рысах была акрэслена тэрыторыя Беларусі, якая павінна была ўключаць «Віленскую, Віцебскую, Гродзенскую, Мінскую і Магілёўскую губерні, заходнія паветы Смаленскай губерні і паўночныя паветы Чарнігаўскай губерні» і падкрэслівалася, што «Беларусь... з'яўляецца адзінай і непадзельнай краінай, звязанай братэрскай сувяззю са ўсёй астатняй Федэратыўнай Расійскай Рэспублікай» [11, с. 97]. Зноў жа, да «ідэі ўтварэння аўтаномна-свабоднай Беларусі як часткі Расійскай Федэратыўнай Рэспублікі» звярнуўся 17 лістапада 1917 г. у сваёй дэкларацыі Беларускі Абласны Камітэт, заснаваны пры Усерасійскім Савеце Сялянскіх Дэпутатаў у Петраградзе. [11, с. 101].

Чарговым крокам на шляху вырашэння дзяржаўна-тэрытарыяльнага пытання быў Першы Усебеларускі з'езд, скліканы ў снежні 1917 г. 8 снежня 1917 г. газета «Вольная Беларусь» паведамляла, што «на з'ездзе будзе ісці гутарка пра абвяшчэнне Беларускай дэмакратычнай рэспублікі ў складзе Віленшчыны, Міншчыны, Магілёўшчыны, Віцебшчыны, Гродзеншчыны, паўночнай часткі Чарнігаўшчыны, заходніх паветаў Смаленшчыны». Разам з тым тэрытарыяльнае пытанне на з'ездзе не было ў ліку прыярытэтных [12, с. 66]. У прынятай на з'ездзе пастанове абвяшчалася неабходнасць «зацвярджэння рэспубліканскага дэмакратычнага ладу ў межах Беларускай зямлі дзеля выратавання роднага краю і аховы яе ад падзелу» [11, с. 106].

Такім чынам, на працягу разглядаемага перыяду прадстаўнікі беларускіх арганізацый імкнуліся ў той ці іншай форме вырашыць дзяржаўна-тэрытарыяльнае пытанне. Праўда, калі напачатку беларусы абмяжоўваліся дэкларацыямі і зваротамі да германскіх акупацыйных улад, а потым і да Часовага ўрада, і спадзяваліся на іх падтрымку пры вырашэнні гэтага пытання, то пастуова прыходзіла ўсведамленне неабходнасці абапірацца ў першую чаргу на ўласныя сілы. Але гвалтоўны разгон з'езда бальшавікамі ў ноч з 17 на 18 снежня 1917 г. не дазволіў беларусам вырашыць праблему дзяржаўна-тэрытарыяльнага вызначэння з апорай на ўласныя сілы.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Варонка, Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году: карот. агляд / Я. Варонка. — Коўна: Друк. А. Бака і Х. Манкес, 1920.
2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / М. Біч [і інш.]; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск: Экаперспектыва, 2005. — Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII — пачатак XX ст.).
3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI ст.: у 2 кн. / А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск: Беларус. навука, 2011. — Кн. 1.
4. Дзяржаўны архіў Літвы. — Фонд 582. — Воп. 1. — Спр. 15.
5. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў. Т. 1: 1917—1922 гг. — Мінск: БелНДІДАС, 1997.
6. Круталевич, В.А. Рождение Белорусской Советской Республики (На пути к провозглашению республики: октябрь 1917 — декабрь 1918 гг.). — Минск: Наука и техника, 1975.
7. Крывіч. — 1924. — № 1 (7).
8. Ладысеў, У.Ф. Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917—1939 гг.). / У.Ф. Ладысеў, П.І. Брыгадзін — Мінск: БДУ, 2003.

9. Рудовіч, С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе / С. Рудовіч. — Мінск: Тэхналогія, 2001.
10. Советско-германские отношения от переговоров в Брест-Литовске до подписания Раппальского договора. — М: Изд-во полит. лит-ры, 1968.
11. Турук, Ф. Белорусское движение. Очерк национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. — М.: Гос. изд-во, 1921.
12. Хомич С.Н. Территория и государственные границы Беларуси в XX веке: от незавершенной этнической самоидентификации и внешнеполитического произвола к современному status quo. — Минск: Экономпресс, 2011.

**Марозаў Сяргей Паўлавіч**
*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Я. Купалы (Гродна, Беларусь)*

# КАНЦЭПЦЫЯ КАНФЕДЭРАЦЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ДУМЦЫ (1915—1916 гг.)

Адной са старонак Першай сусветнай вайны ў Беларусі з’яўляюцца пошукі яе нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання. Беларуская палітычная думка набліжалася тады да ідэалу незалежнай дзяржавы двума альтэрнатыўнымі шляхамі: 1) шляхам рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці ў межах адроджанага Вялікага княства Літоўскага (вядома, ужо ў новых формах і на іншай аснове); 2) у якасці аўтаномнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў межах гіпатэтычнай Расійскай дэмакратычнай рэспублікі [10, с. 285].

Першы напрамак палітычнай ідэалогіі, да нядаўняга часу навуцы мала вядомы, выклікае з сярэдзіны 1990-х г. вялікую цікавасць айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Яго вывучэннем займаліся А. Грыцкевіч, Ю. Весялкоўскі, А. Ціхаміраў, С.М. Хоміч, А. Смалянчук, У.Я. Снапкоўскі, М.Б. Шчаўлінскі, З. Шыбека, М.В. Цуба і інш. Гісторыя ідэй і праектаў аднаўлення ВКЛ у 1915—1918 г. выдзяляецца ў самастойную даследчую тэму. Ёй прысвяцілі спецыяльныя работы даследчыкі з Беларусі (А. Сідарэвіч [9; 11], С. Багалейша [2], В.А. Ашарчук [1]), Літвы (Р. Лапата [13], Э. Гімжаўскас [6; 7]), Канады (З. Панарскі [14]).

Ужо сама адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Обер Ост, утвораная немцамі на акупаваных у 1915 г. землях Літвы і Беларусі, сваімі межамі і абрысамі нагадвала Вялікае Княства Літоўскае 1793—1795 г., ад якога не істотна рознілася і плошчай (адпаведна 112 тыс. і 120 тыс.